УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
18 красавіка 2019 г. № 150

# Аб афіцыйных геральдычных сімвалах

У мэтах захавання і развіцця гістарычных традыцый Магілёўскага раёна пастанаўляю:

1. Заснаваць:

герб Магілёўскага раёна;

флаг Магілёўскага раёна.

2. Зацвердзіць:

Палажэнне аб гербе Магілёўскага раёна, яго апісанне і выяву (прыкладаюцца);

Палажэнне аб флагу Магілёўскага раёна, яго апісанне і выяву (прыкладаюцца).

3. Фінансаванне расходаў на выраб заснаваных дадзеным Указам афіцыйных геральдычных сімвалаў ажыццяўляць за кошт сродкаў, прадугледжаных у раённым бюджэце Магілёўскага раёна, і іншых крыніц у адпаведнасці з заканадаўствам.

4. Дадзены Указ уступае ў сілу пасля яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь** **А.Лукашэнка**

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
18.04.2019 № 150

## ПАЛАЖЭННЕ
## аб гербе Магілёўскага раёна

1. Герб Магілёўскага раёна з’яўляецца яго афіцыйным геральдычным сімвалам.

Герб Магілёўскага раёна – уласнасць Магілёўскага раёна, права распараджэння якой мае Магілёўскі раённы выканаўчы камітэт.

2. Выява герба Магілёўскага раёна размяшчаецца на будынках, у якіх знаходзяцца органы мясцовага кіравання і самакіравання Магілёўскага раёна, а таксама ў памяшканнях для пасяджэнняў гэтых органаў і службовых кабінетах іх кіраўнікоў.

Пры адначасовым размяшчэнні Дзяржаўнага герба Рэспублікі Беларусь, герба Магілёўскага раёна і іншых гербаў іх размяшчэнне вызначаецца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 5 ліпеня 2004 г. № 301-З «О государственных символах Республики Беларусь».

Герб Магілёўскага раёна можа выкарыстоўвацца падчас дзяржаўных свят і святочных дзён, урачыстых мерапрыемстваў, якія праводзяцца дзяржаўнымі органамі і іншымі арганізацыямі, а таксама пры правядзенні культурных і спартыўных мерапрыемстваў.

3. Права на выкарыстанне герба Магілёўскага раёна ў выпадках, не ўказаных у пункце 2 гэтага Палажэння, можа быць дадзена па рашэнні Магілёўскага раённага выканаўчага камітэта.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
18.04.2019 № 150

**Апісанне герба Магілёўскага раёна**

Герб Магілёўскага раёна ўяўляе сабой варажскі шчыт, перасечаны дзвюма хвалістымі палосамі: верхняя – серабрыстага колеру, ніжняя – зялёнага колеру. Пры гэтым верхняя паласа складае 1/2 ніжняй. У верхнім полі блакітнага колеру размешчана фігура рыцара серабрыстага колеру, які трымае ў паднятай руцэ меч серабрыстага колеру. У ніжнім полі серабрыстага колеру пад хвалістымі палосамі знаходзяцца тры кветкі лёну блакітнага колеру з залацістым асяродкам.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
18.04.2019 № 150

**Выява герба Магілёўскага раёна (каляровая)**



ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
18.04.2019 № 150

**Выява герба Магілёўскага раёна**
**(з перадачай колеру ўмоўнай шафіроўкай)**



ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
18.04.2019 № 150

**ПАЛАЖЭННЕ**
**аб флагу Магілёўскага раёна**

1. Флаг Магілёўскага раёна з'яўляецца яго афіцыйным геральдычным сімвалам.

Флаг Магілёўскага раёна – уласнасць Магілёўскага раёна, права распараджэння якой мае Магілёўскі раённы выканаўчы камітэт.

2. Флаг Магілёўскага раёна размяшчаецца на будынках, у якіх знаходзяцца органы мясцовага кіравання і самакіравання Магілёўскага раёна, а таксама ў памяшканнях для пасяджэнняў гэтых органаў і службовых кабінетах іх кіраўнікоў.

Пры адначасовым размяшчэнні Дзяржаўнага флага Рэспублікі Беларусь, флага Магілёўскага раёна і іншых флагаў іх размяшчэнне вызначаецца ў адпаведнасці з Законам Рэспублікі Беларусь ад 5 ліпеня 2004 г. № 301-З «О государственных символах Республики Беларусь».

Флаг Магілёўскага раёна можа выкарыстоўвацца падчас дзяржаўных свят і святочных дзён, урачыстых мерапрыемстваў, якія праводзяцца дзяржаўнымі органамі і

іншымі арганізацыямі, а таксама пры правядзенні культурных і спартыўных мерапрыемстваў.

3. Права на выкарыстанне флага Магілёўскага раёна ў выпадках, не ўказаных у пункце 2 гэтага Палажэння, можа быць дадзена па рашэнні Магілёўскага раённага выканаўчага камітэта.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
18.04.2019 № 150

**Апісанне флага Магілёўскага раёна**

Флаг Магілёўскага раёна ўяўляе сабой прамавугольнае палотнішча блакітнага колеру з суадносінамі бакоў 1:2, у цэнтры вонкавага боку якога размешчаны герб Магілёўскага раёна.

ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
18.04.2019 № 150

**Выява флага Магілёўскага раёна (каляровая)**



ЗАЦВЕРДЖАНА

Указ Прэзідэнта
Рэспублікі Беларусь
18.04.2019 № 150

**Выява флага Магілёўскага раёна**
**(з перадачай колеру ўмоўнай шафіроўкай)**

